# «МЫ І ЧАС» НАВУЧЫЎ СПАДЗЯВАЦЦА



Рэзаць каўбасу радкамерам, у праграме Page Maker цягаць кавалкі тэксту па газетнай паласе, па некалькі разоў перапісваць артыкул, імгненна ствараць эпіграмы на вершы віцебскіх паэтаў... Універсітэцкая газета «Мы і час» была адной з тых прычын, якія вымусілі давучыцца ў ВДУ імя П.М. Машэрава да канца. Творчая атмасфера, якая панавала ў маленькім кабінеце на першым паверсе, не адпускала, надавала сілы, была глытком шчырага крэатыўнага паветра. Зараз, праз многа год, гэта адчуваецца найбольш моцна.

Анастасія Пятроўна Лазебная здолела паяднаць рознахарактарных студэнтаў у адзіную каманду. Першыя планёркі, першыя памылкі... На што мы, карэспандэнты-пачынальнікі, былі здольныя? Што з нас было тады патрабаваць? Мы думалі, што журналістыка – рамантычная краіна, дзе словам можна перавярнуць свет, зрабіць яго лепшым. На жаль, потым усё аказалася зусім па-іншаму... Але спадзеў, закладзены ў «Мы і час», застаўся.

У рэдакцыі ўніверсітэцкай газеты мы вучыліся на сваіх недарэчнасцях, умацоўвалі журналісцкую смеласць і вастрыню слова, вызначалі галоўнае і адкідалі дробнае... Каб не было газеты «Мы і час», нават не ведаю, ці паспрабаваў бы я сябе ў журналістыцы, якой аддаў пяць год жыцця падчас працы ў «Полацкім весніку».

Ёсць шмат чаго ўспомніць... Светлая ўсмешка Ганны Пажарскай, актуальныя кпіны Ірыны Грумандзь, сумныя вочы і чароўныя малюнкі Каці Зараевай... Без гэтага не магу ўявіць сваё студэнцтва.

«Мы і час» навучыла мяне задаваць пытанні, кіраваць размовай рэспандэнта, самымі простымі словамі адлюстроўваць атмасферу важных падзей, бязлітасна скарачаць тэксты свае і чужыя... Усё гэта неверагодна спатрэбілася ў будучай прафесіі... І зараз, калі працую кіраўніком літаратурнай часткі Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа, не забываю, адкуль бярэ пачатак маё майстэрства як творцы слова. І радуюся, што адным з маіх настаўнікаў была добрая і патрабавальная Анастасія Пятроўна.

...Седзячы за рэдакцыйным камп'ютарам, гледзячы, як бягуць па Маскоўскім праспекце машыны, я не раз думаў, якім чынам буду потым успамінаць гэтыя дні. Адказ ёсць: з выключнай падзякай і цёплым душэўным хваляваннем.

**Алесь ЗАМКОЎСКІ,**
**выпускнік факультэта беларускай філалогіі і культуры, кіраўнік літаратурнай часткі Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа.**